Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА МАЁЙ РЭКТАРСКАЙ ПРАЦЫ

Падобных ідэалагічных напрацовак у любым універсітэце хапае, і яны адразу ж укараняліся ў вучэбны працэс, станавіліся задзейнічанымі ў навучанні і выхаванні будучых кіраўнікоў усіх узроўняў. І гэта адна з асноўных задач комплекснай падрыхтоўкі спецыяліста ў ВНУ. Выпускнік універсітэта, ці то гэта інжынер, тэхнолаг, аграном, урач, настаўнік, афіцэр, з часам узначаліць калектыў, павінен будзе арганізаваць падначаленых на выкананне службовых абавязкоў, натхніць на дасягненне пастаўленых ім жа самім мэт. І пры гэтым сваім прыкладам кіраўнік павінен паказаць прыхільнасць дзяржаўнай палітыцы, ідэалагічную перакананасць, павагу да закона і асобы. Поруч з высокай падрыхтоўкай як спецыяліста гэтыя якасці павінны быць яму прывіты яшчэ ва ўніверсітэцкім вучэбным працэсе, студэнт павінен іх увабраць як непасрэдны ўдзельнік распрацоўкі і рэалізацыі ідэалагічных дактрын. Трэба на гэта скіроўваць арганізатараў вучэбна-выхаваўчага працэсу. А ў сваім універсітэце я бачыў, як гэта ўсё робіцца, і сам прымаў у гэтым удзел, традыцыі тут у нас былі моцныя. Сярод нашых выпускнікоў — першы Прэзідэнт Беларусі! І ганарыцца ёсць чым, і абавязвае...

Выхаваўчую працу са студэнтамі ў нас ажыццяўлялі прафесіяналы. Зразумела, што гэта рабілі ўсе выкладчыкі, прычым перш за ўсё сваім прыкладам — як высокага класа вучоныя, мудрыя педагогі і аўтарытэтныя людзі. Аднак важна было знайсці людзей, якія змаглі б арганізаваць выхаваўчую работу са студэнтамі сістэмна, у тым ліку і ў пазаўрочны час. І для вырашэння гэтай задачы яшчэ рэктар Я. П. Кудрашоў, а пасля яго рэктар М. А. Аўласевіч дадумаліся запрасіць у інстытут былых сакратароў райкамаў КПСС, якія курыравалі ідэалагічную работу, — Т. М. Кузьміну, Л. І. Будкову, Т. І. Гаўрыленку, А. І. Зуб. Зразумела, што яны былі выхаваны, як тады і ўсе мы, на камуністычнай ідэалогіі, але, па-першае, яна дастаткова цэласная і для многіх людзей заўсёды будзе прывабнай, па-другое, у сакратары райкамаў адбіраліся разумныя і здольныя да грамадскай работы людзі, таму запрасіць такіх спецыялістаў для арганізацыі выхаваўчай работы са студэнтамі было правільным рашэннем.

Да рэалізацыі развіцця на базе ўніверсітэта ідэі ідэалагічнага цэнтра істотна дадала мая палітычная работа ў якасці даверанай асобы Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах у 2001 годзе. Я тады ўзначаліў ініцыятыўную групу па Магілёўскай вобласці і выступаў у працоўных калектывах — у цэхах, на фермах, ва ўніверсітэтах, у дварах жылых кварталаў, у школах, бальніцах, у раённых дамах культуры. У працэсе гэтай палітычнай работы пазнаёміўся з кіраўнікамі рэспублікі, вобласці і ўсіх яе раёнаў, дырэктарамі многіх буйных прадпрыемстваў і фірм. У гэты час мы паспрабавалі арганізаваць першыя сустрэчы калектываў універсітэта і прамысловага прадпрыемства. Пачалі з Магілёўскай ткацкай фабрыкі. Я там добра ведаў дырэктара — Ніну Рыгораўну Пятрову — разумнага і дзейнага кіраўніка. Кіраўніцтва фабрыкі паказала нам сваю вытворчасць, а мы арганізавалі сустрэчу рабочых, інжынераў і тэхнолагаў з вучонымі ўніверсітэта. Кожны з жадаючых мог паслухаць, што даследуюць зараз фізікі, хімікі, біёлагі, над якімі праблемамі працуюць філосафы, як сучасныя гісторыкі бачаць наша мінулае. Бацькі маглі атрымаць кансультацыю ў прафесійных псіхолагаў і педагогаў па пытаннях выхавання і навучання дзяцей, напрамую пагаварыць з аўтарамі школьных падручнікаў. Завяршылі мы сустрэчу канцэртам, а ён жа ў нас быў падрыхтаваны і выкананы прафесіяналамі. Цікавасць да таго, што робіцца ва ўніверсітэце, у людзей была непадробная. Мы ж у папулярнай форме дэманстравалі ўзровень адукацыйнай культуры і называлі знакамітых выпускнікоў нашага ўніверсітэта, у тым ліку і першага Прэзідэнта краіны. Вось і дзейная, жывая, пераканаўчая ідэалагічная работа.

Такія сустрэчы мы пачалі праводзіць рэгулярна, прыцягваючы да іх арганізацыі ўсё большую колькасць выкладчыкаў і студэнтаў. Яны прайшлі на вытворчым аб'яднанні «Хімвалакно», на камбінаце шаўковых тканін. Пра гэтыя сустрэчы ў горадзе загаварылі, людзям яны падабаліся. Эфектыўнасць падобнай ідэалагічнай работы з людзьмі заўважыў і губернатар Магілёўскай вобласці Барыс Васільевіч Батура. Ён неяк запрасіў мяне да сябе і сказаў:

— Прэзідэнт плануе наведаць Касцюковіцкі раён. Там на цэментным заводзе мы ўсталявалі новую газатурбінную печ, увесь цэмент, што вырабляюць, раскупляюць з калёс, пабудавана сучасная раённая бальніца, прыведзены ў парадак вуліцы і дамы, але... не хапае душы! Радзькоў, «накрый» універсітэтам раён!

У гэты момант я канчаткова зразумеў: у развіцці ўніверсітэта, у вызначэнні яго прыкметнай асаблівасці мы на правільным шляху. Універсітэт — гэта рэгіянальны цэнтр дзейнай і пераканаўчай ідэалагічнай работы.

Касцюковіцкі раён мы «накрылі»! Гэта ж радзіма Аркадзя Куляшова, імя якога носіць наш універсітэт. Лірык, філосаф, патрыёт. Аўтар бессмяротных радкоў:

Цвёрда трымаўся юнак на дапросе,
Тоячы словы і думкі свае...
і
Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся,
Бывай, смуглявая, каханая, бывай...

Нашы выкладчыкі і студэнты пабывалі ва ўсіх школах гэтага раёна, на буйных прадпрыемствах, выступалі там з лекцыямі і канцэртамі, на выстаўках дэманстравалі нашы дасягненні, давалі прафесійныя кансультацыі, мы нават падзяліліся камп'ютарнай тэхнікай і кнігамі для бібліятэк.

Маштабная ідэалагічная работа ўніверсітэта ў рэгіёне дала яшчэ і прыкметны рэзультат па прыцягненні ў нашу ВНУ абітурыентаў. Мы традыцыйна працягвалі рыхтаваць настаўнікаў для сярэдніх школ. Папулярнасць жа педагагічнай прафесіі ўжо ў пачатку дзевяностых прыкметна знізілася: вырас попыт на юрыстаў, эканамістаў, праграмістаў. Усе магілёўскія ВНУ пачалі адкрываць гэтыя спецыяльнасці. Нават машынабудаўнічы інстытут адкрыў падрыхтоўку спецыялістаў для камерцыйнай дзейнасці. Тэхналагічны інстытут традыцыйна забяспечваў кадрамі грамадскае харчаванне, хімічную вытворчасць, сферу перапрацоўкі сельгаспрадукцыі і недахопу ў абітурыентах не меў. Горацкая акадэмія рыхтавала аграномаў, інжынераў-механікаў, эканамістаў для сельгаспрадпрыемстваў, у тым ліку і для фермерскіх гаспадарак, чым і прывабіла да сябе на вучобу перш за ўсё сельскую моладзь. Канкурыраваць нам з гэтымі ВНУ было цяжка.

У такой сітуацыі мы вырашылі паставіць на высокую якасць вучэбнага працэсу, на прывабнасць навуковых даследаванняў і, у прыватнасці, на занятасць студэнтаў у пазаўрочны час захапляльнымі і карыснымі заняткамі — у спартыўных секцыях і навуковых гуртках, у творчых калектывах. Тым самым мы планавалі забяспечыць прывабную для маладых людзей агульную культуру жыцця ва ўніверсітэце і ў першую, і ў другую палову дня. І выкладчыкі і студэнты прынялі гэтыя падыходы, з часам сталі традыцыйнымі і папулярнымі ў студэнтаў Дзень першакурсніка, конкурс «Найлепшы будучы настаўнік года», першакрасавіцкая «Гумарына», агляд мастацкай самадзейнасці, прэзентацыі кафедр, спартыўныя спаборніцтвы паміж факультэтамі з прыцягненнем заўзятараў, удзел студэнтаў у сустрэчах з працоўнымі калектывамі, нарады рэктара са студэнцкім актывам. Усё гэта і стварала насычаную атмасферу бягучага жыцця ўніверсітэта.

Напрыклад, у верасні я штогод праводзіў сустрэчы з першакурснікамі. Выступаў перад імі з расповедам пра гісторыю нашай ВНУ, пра знакамітых выпускнікоў, пра буйных вучоных, якія працавалі ці працуюць у нас, але ведаюць іх ва ўсім свеце. Гаварыў пры гэтым, што вучыцца цяжка, шмат адлічэнняў, але любы наш выкладчык, дэкан зразумее, калі раптам у студэнта ўзнікнуць форс-мажорныя абставіны, і пойдзе яму насустрач. Але пры ўмове, што ты не адпеты прагульшчык заняткаў і не гультай. Калі вы не знаходзіце паразумення ў дэканаце, у вас ёсць права непасрэдна звярнуцца да рэктара. Я перад вамі і абяцаю, што заўсёды выслухаю і пастараюся даць яшчэ адзін шанц, каб выйсці са складанай сітуацыі.

На гэтых сустрэчах я папярэджваў першакурснікаў, што яны ўступілі ў дарослае жыццё, у гэты час пачынаецца закаханасць, прытым у гэтым узросце яны эмацыянальна вельмі моцныя. Мы ўсе зацікаўлены, каб вы не толькі атрымалі добрую прафесійную адукацыю, але і ўладкавалі сваё асабістае жыццё. Гэта таксама няпроста, і часта ў гэтых пытаннях не ўсё складваецца так, як хацелася б. Але не трэба адчайвацца і скакаць з акна з-за, напрыклад, непадзеленага кахання. Пагаварыце пра гэта з бацькамі, з куратарам студэнцкай групы, з сябрам-старшакурснікам. Гэта для вас у дадзеным выпадку закончылася жыццё, а ваш дэкан назірае падобныя «трагедыі» кожны год і таму мае вялікі вопыт іх вырашэння.

Усіх студэнтаў, асабліва хлопцаў з ваенна-спартыўнага факультэта, я прасіў у любой сітуацыі, дзе б яны ні былі і чым бы ні займаліся, заўсёды памятаць, што асабіста прадстаўляюць універсітэт — установу самай высокай культуры ў грамадстве. Няхай нават вы ў летнія канікулы падпрацоўваеце гандлем на стадыёне «Спартак». І калі пры гэтым гучна мацюкаецеся, хаміце, то што ў такім выпадку падумаюць пра вашага дэкана, пра рэктара?

Такія сустрэчы, безумоўна, найболей эфектыўныя на першым курсе, дзе закладваюцца асновы ўніверсітэцкай культуры. На выпускным курсе студэнты думаюць пра будучую работу, пра ўладкаванне сябе ў жыцці, і з імі трэба ўжо гаварыць на гэтыя тэмы. Хачу заўважыць, што на сустрэчах з першакурснікамі студэнты непасрэдна, у даверлівай размове знаёмяцца з рэктарам. І пасля, пры сустрэчах у калідорах універсітэта ці на вуліцах горада, абавязкова з ім вітаюцца, бо ведаюць яго. Таму мяне здзіўляла, калі я як міністр ішоў з рэктарам па калідорах яго ВНУ, а з намі ніхто не вітаўся. Ну няхай са мною, але са сваім рэктарам?..

Выпадкаў, калі студэнты давяралі мне свае праблемы, было нямала. Як правіла, яны былі звязаны з просьбай дазволіць у парадку выключэння яшчэ адну пераздачу экзамену. Але ўзнікалі і нестандартныя сітуацыі. Прывяду два прыклады.

Аднойчы ў ліпені да мяне на прыём прыйшла студэнтка тэхналагічнага інстытута з просьбай дазволіць ёй перавод на другі курс нашага ўніверсітэта. Я паглядзеў яе залікову кніжку і выказаў сваё здзіўленне:

— Вы нядрэнна вучыцеся, у вас у залікоўцы толькі добрыя і выдатныя адзнакі. І спецыяльнасць у вас для жыцця грунтоўная — халадзільнае абсталяванне. Што ж вас так прыцягвае на фізмаце?

І чую ў адказ:

— Не загружана галава! Хачу болей глыбока паглыбіцца ў вывучэнне фізікі і матэматыкі. Таксама я ведаю, што ў вашым універсітэце цікава вучыцца.

І яшчэ прыклад. На прыём прыйшла студэнтка, якая закончыла тры курсы філалагічнага факультэта, з просьбай выдаць ёй атэстат. Па правілах атэстат захоўваўся ў асабістай справе студэнта, пакуль ён вучыўся ва ўніверсітэце. Прычыну яна патлумачыла. На факультэце займалася ў творчай студыі і вырашыла паспрабаваць паступаць у Вышэйшае тэатральнае вучылішча імя М. С. Шчэпкіна. На курс да Юрыя Саломіна. Адлічацца з універсітэта не хацела: конкурс у вучылішча вельмі высокі, можа і не паступіць. Я ўбачыў арганізаваную, мэтанакіраваную дзяўчыну з сур'ёзнымі намерамі, пад сваю адказнасць дазволіў ёй выдаць атэстат. Паступіць — адлічым. Не паступіць — прадоўжыць навучанне на нашым філфаку. Паступіла. Пасля заканчэння вучылішча была прынята ў трупу маскоўскага тэатра імя У. Маякоўскага. Гэты тэатр у 2002 годзе быў на гастролях у Магілёве, і яна прывяла калег-артыстаў у свой універсітэт, папрасіла, каб іх прыняў рэктар. Мне, дарэчы, з гэтай сустрэчы запомнілася, што маскоўскім артыстам спадабаліся малыя скульптурныя формы ўздоўж вучэбнага корпуса аўтарства нашага выкладчыка Андрэя Вараб'ёва. Усе артысты маскоўскага тэатра ў адзін голас гаварылі, што падобныя нашым камп'ютарныя класы, вучэбныя кабінеты і этнаграфічныя музеі яны бачылі ў кожнай ВНУ, а вось такія арыгінальныя скульптуры — толькі ў нас! І тады я яшчэ раз пераканаўся, што ва ўніверсітэце ўсё павінна працаваць якасна, усе напрамкі яго развіцця павінны быць перспектыўнымі, але і нешта павінна быць сваё, адрознае ад іншых ВНУ.

Развіццё ўніверсітэта як рэгіянальнага ідэалагічнага цэнтра паступова набірала сілу. У гэтым кірунку працавалі вучоныя, педагогі, студэнцкі актыў. У вобласці сталі папулярнымі нашы сустрэчы з працоўнымі калектывамі прамысловых прадпрыемстваў, і мы вырашылі правесці дні ўніверсітэта ў горадзе Магілёве. Спланавалі на тры красавіцкія дні выступленні нашых вучоных з папулярнымі лекцыямі на заводах і фабрыках, арганізавалі для ўсіх ахвотных ва ўніверсітэце і на прадпрыемствах кансультацыі юрыстаў, эканамістаў, біёлагаў, педагогаў, псіхолагаў, трэнераў па многіх відах спорту. А на гарадскім стадыёне вырашылі правесці спартыўнае свята з прыгожымі фізкультурнымі выступленнямі, спаборніцтвамі паміж факультэтамі і паказальнымі выступленнямі чэмпіёнаў краіны, свету і Алімпійскіх гульняў. Рыхтаваў гэта свята фізкультурны факультэт на чале з дэканам В. В. Шутавым, і запрасілі мы на яго выпускнікоў сярэдніх школ горада, усіх студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Сваім загадам я адмяніў у гэты дзень усе заняткі.

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг.
Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14 мая).

(Працяг будзе 4 чэрвеня.)

Гасцёўня «Звязды»

НЕСЦІ ЛЮДЗЯМ РАДАСЦЬ І СУПАКАЕННЕ —

у гэтым бачыць місію Белдзяржфілармоніі яе кіраўнік

Фота Белдзяржфілармоніі.

Творчыя людзі — вялікая сіла. Яны надзелены своеасаблівым бачаннем свету і любоўю да мастацтва. Без сумнення, менавіта з такіх складаецца і калектыў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. І сёлета ў красавіку ўстанова адзначыла 85 гадоў з дня адкрыцця. За гэты час у яе гісторыю запісана ўжо шмат падзей, мноства біяграфій выдатных асоб, якія служылі і служаць музыцы, высокаму мастацтву. Мы сустрэліся з цяперашнім генеральным дырэктарам Белдзяржфілармоніі Аляксандрам НІКІТАМ, каб пагаварыць пра рэаліі існавання музычнага мастацтва, зазірнуць у перспектыву і падвесці прамежкавыя вынікі зробленага.

— Мне пашчасціла студэнтам трапіць у каманду толькі што створанага Прэзідэнцкага аркестра. Гэта дазваляла нам па некалькі разоў на тыдзень бываць на розных мерапрыемствах, сустрэчах на найвышэйшым узроўні. Кіраўнік дзяржавы мог падысці да нас і так, лічы, па-бацькоўску папрасіць: «Вы ж толькі не падвядзіце мяне!» — згадвае Аляксандр Іванавіч. — Тады я ўпершыню ўсвядоміў, што высокі кіраўнік — у першую чаргу чалавек. І гэтую выснову праношу па жыцці. Той час, калі былі гастролі, творчасць, дысцыпліна, усіх нас вельмі загартаваў. Пасля я трапляю ў калектыў да народнай артысткі Беларусі Валянціны Гаявой. І там ужо зусім іншы вопыт. Я працаваў з легендарнай асобай. Валянціна Іванаўна — увасабленне беларускай жанчыны, з усімі яе перажываннямі, складаным лёсам і сапраўдным патрыятызмам. Яна — сімвал працавітага беларускага народа і яго непаўторнай народнай творчасці. Толькі ўсведамляючы, што па-сапраўднаму наша, нацыянальнае, беларускае, мы маем магчымасць натхняцца і падсілкоўвацца дзеля стварэння новага. Увогуле, беларусы вельмі цярплівыя і заўсёды ўмеюць выціснуць максімум з сітуацыі. Мы не чакаем, пакуль усё вырашыцца само, і не пакутуем ад праблем, а проста робім кожны сваю справу. Гэта і ёсць базісны код нацыі, які я для сябе адкрыў. Мы людзі не закрытыя і не пустэльнікі, але ўмеем дыпламатычна і філігранна абыходзіць вострыя вуглы. Гэта дае магчымасць беларусам быць меншымі глабалістамі, чым камусьці іншаму. У нас ёсць усведамленне, што вось мы і вось наш кавалак зямлі, дарагі нам. І калі казаць пра тых жа творчых людзей, то ў нас усё робіцца з любоўю да Радзімы і з павагай да ўсіх астатніх. Хоць не абыходзіцца без самакрытыкі і самаедства, што характэрна творцам. Здавалася б, набор нот заўсёды адзін і той жа, аднак прачытаць яго кожны можа па-свойму...

— Чым цяпер жыве Белдзяржфілармонія? Што ўдалося рэалізаваць з задуманага за пакуль непрацяглы час вашага кіраўніцтва?

— Я магу сказаць, што лічу сябе адным з самых шчаслівых людзей у нашай культурнай сферы, паколькі ў філармоніі працуюць творцы абсалютна розных напрамкаў. Гэта і Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зніч», які мае сваю публіку і збірае залы, і Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, і камерны аркестр, і іншыя. Сёння публіка прыходзіць да кожнага. І мы разумеем, наколькі розная гэта аўдыторыя.

У нас ёсць і сацыяльныя праграмы для дзяцей. Вялікую ўвагу ўдзяляем маладзёжнай палітыцы і духоўнаму развіццю нацыі. Уся музыка, якая выконваецца ў гэтых сценах нашымі артыстамі, жыццесцвярджальная. Мы не проста ставім у праграму творы, а адбіраем кожны, улічваючы глыбокі сэнс і пасыл. І для таго, каб выйсці і выканаць іх перад гледачамі, патрэбна супадзенне многіх фактараў. Спачатку — каб людзі атрымалі музычную адукацыю розных ступеняў (музычная школа, каледж, ВНУ). Хоць лічу, што музыканты вучацца ўсё жыццё. Калі мы разумеем, што працуем з чалавекам, які 20 гадоў аддаў адукацыі, то такія кадры вельмі каштоўныя. І я, як кіраўнік і па адукацыі музыкант, разумею, наколькі важна служыць сваім артыстам. Ніхто не можа хадзіць і хваліцца заслугамі, пакуль яго артысты нечым не забяспечаны (калі ў памяшканні холадна альбо музыкантам няма на чым іграць)...

«Музыка кіно, рок у новым гучанні ці музыкатэрапія — тут ёсць шырокі выбар для любых густаў і ўзростаў».

Філармонію любяць, і нам дапамагаюць. За адзін толькі мінулы год мы набылі вялікую колькасць інструментаў, прычым вельмі рэдкіх: майстровых скрыпак, альтоў, віяланчэляў. Калі мяне толькі прызначылі на пасаду генеральнага дырэктара, я разумеў, на якім узроўні наш калектыў знаходзіцца і якога ўзроўню музыканты тут працуюць. І стаяла задача — захаваць іх і тое, што яны ўмеюць. І нам гэта ўдалося нават ва ўмовах сутыкнення з рознымі знешнімі фактарамі. Бо калектыў не апусціў рукі, а ўсе працягвалі працаваць. Зараз мы таксама робім новыя праграмы, шукаем рынкі для супрацоўніцтва, каб быць цікавымі і запатрабаванымі не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. За першы квартал, напрыклад, нават насуперак санкцыям і іншым настроям мы зрабілі ўжо шэраг міжнародных праектаў. Таму што, нягледзячы ні на што, мы бачым сваё прызначэнне ў тым, каб несці людзям радасць і супакаенне. Ніякіх ілюзій адносна таго, што ўсё само сабой наладзіцца і будзе як раней, у нас няма. Гэта і дае магчымасць дзейнічаць адпаведна патрабаванням часу.

За мінулы год у Белдзяржфілармоніі далі 1300 канцэртаў, і нават у 2020-м іх колькасць дасягала без малога тысячу. І калі разумееш, што робіцца гэта сіламі 14 творчых калектываў (яны працуюць штодня ў рэжыме «раніцай — рэпетыцыя, а вечарам — канцэрт»), то разумееш, што тут працуюць людзі, апантаныя сваёй справай. Музыка кіно, рок у новым гучанні ці музыкатэрапія — тут ёсць шырокі выбар для любых густаў і ўзростаў. Зараз у філармоніі вядзецца работа над стварэннем уласнага стрымінгавага сэрвісу. Гэта дазволіць рабіць канцэрты даступнымі для людзей і з абмежаванымі магчымасцямі. Яны змогуць набываць білеты на выступленні любімых артыстаў і музыкантаў хоць у іншым канцы свету.

— Што ў наш час больш уплывае на запатрабаванасць гледачом канцэртнай праграмы: артыст ці змест?

— Мы назіраем зараз асаблівую цікавасць да класічнай, акадэмічнай музыкі. Мне як музыканту вельмі радасна ўсведамляць, што людзі сталі больш шанаваць высокае мастацтва. Напрыклад, з якой бы праграмай ні выступаў Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча, заўсёды збіраюцца поўныя залы. Таму не бяруся сцвярджаць, на што ходзяць больш. Адзінае — ёсць невялікая складанасць з данясеннем інфармацыі, бо аўдыторыя ў нас вельмі розная і па ўзросце, і па інтарэсах. Таму робім стаўку на разнажанравасць, каб гледачы заўсёды мелі выбар.

— Заступаючы на пасаду, вы сярод іншага адзначылі, што беларуская культура недастаткова прадстаўлена як брэнд. Як, па-вашаму, трэба дзейнічаць у гэтым кірунку?

— Нам не хапае ўмення падаваць сябе на міжнароднай арэне. Мы маем добры прадукт, але няма для яго належнай упакоўкі. І няма ўмення прадаваць. Бо можна колькі заўгодна развіваць артыстаў, купляць новыя інструменты, але пры няўдалым менеджменце ніхто так і не даведаецца, якога ўзроўню калектыў і чаго варта тое, што ён робіць. Мы, напрыклад, адсочваем, як нашы артысты пазіцыянуюць сябе ў тых жа сацыяльных сетках. Нават у прэс-рэлізе трэба расказваць пра канцэрт, фестываль ці праект так, каб адчувалася любоў да зробленага.

— А па вашых адчуваннях і назіраннях, ці змянілася апошнім часам сітуацыя адносна таго, што мы пачалі больш любіць і цаніць сваё?

— Мне здаецца, кардынальна ўсё змянілася пасля падзей 2020 года. Прыйшло ўсведамленне, што мы можам страціць. Многае ўспрымалася як належнае. Сёння я з задавальненнем назіраю за эвалюцыяй беларускага грамадства, калі людзі адчулі ўласную значнасць на розных узроўнях. Быў перыяд, калі мы дзейнічалі эмацыянальна, а акцэнты навокал змяняліся, але ўсё ж не страцілі арыенціраў. Пасля людзі пачалі больш цягнуцца да прыгожага і разумець: гэта наша, беларускае. Сёння нам удалося захаваць тое, што было назапашана папярэднікамі. І важна, каб так было і надалей.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва Аляксандра НІКІТЫ.
Поўны тэкст інтэрв'ю — на сайце zviazda.by

Свята мастацтваў з новымі акцэнтамі

Сёлета на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўпершыню будзе ўручацца прэмія імя народнага артыста СССР і Беларусі Ігара Лучанка.

Як паведаміла журналістам **начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры Іна АДАМОВІЧ,** узнагароду будуць уручаць у рамках правядзення XX юбілейнага дзіцячага музыкальнага конкурсу. Прысуджацца яна будзе самаму яркаму і таленавітаму з юных выканаўцаў падчас гала-канцэрта ці цырымоніі закрыцця фестывалю — за найлепшае ўвасабленне славянскай тэмы ў эстрадным мастацтве.

«У канцэпцыі фестывалю 2022 года, безумоўна, знайшла адлюстраванне тэма Года гістарычнай памяці і юбілей міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу. У сувязі з гэтым будуць новыя падыходы. Захоўваючы старыя добрыя традыцыі, фестываль, безумоўна, закладзе і новыя, пакажа шмат новых праектаў, якія будуць запатрабаваны шырокай аўдыторыяй, рознымі катэгорыямі гледачоў», — адзначыла Іна Адамовіч.

Увогуле, фестываль «Славянскі базар у Віцебску» сёлета пройдзе з 13 да 18 ліпеня (з адкрыццём 14-га і закрыццём 17-га). Для гасцей і жыхароў горада падрыхтавалі маштабную і цікавую праграму, дзе любы ахвотны знойдзе нешта сабе па душы: канцэрты вядомых і любімых артыстаў, тэатральныя сустрэчы (дзе адбудуцца паказы рэпертуарных спектакляў і будуць працаваць творчыя лабараторыі). На сцэне Летняга амфітэатра прэзентуюць «Цыркавую феерыю». Таксама традыцыйнай і неад'емнай часткай вялікага свята стануць Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск» (ён пройдзе сёлета 31-ы раз) і Дзіцячы музычны конкурс.

«Гэта падзея планетарнага маштабу, таму што вось ужо 20 гадоў конкурс нараджае новых зорачак. І мы бачым, як яны не толькі ярка гараць на небасхіле нашай беларускай эстрады — многія з іх наступаюць на пяты сталым артыстам», — лічыць **дырэктар Дырэкцыі міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» Глеб ЛАПІЦКІ.**

Алена ДРАПКО.